Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
____________ Ю. П. Бондар
«___» ____________2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД - ____ / баз .

# ДАДАТКОВЫ НАРОДНЫ ІНСТРУМЕНТ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць*
*(інструментальная музыка), спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02*
*Інструментальная музыка духавая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А. Л. Карацееў,* прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*А. І. Кавалёў,* дацэнт кафедры музычна-інструментальных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*В. М. Ушакова,* прафесар кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар педагагічных навук, прафесар

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 19.12.2013 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 20.02.2014 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Л. Карацееў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Дадатковы народны інструмент» спрыяе фарміраванню ў студэнтаў навыкаў выканальніцтва на беларускіх народных духавых інструментах на лепшых узорах фальклорнай і сучаснай народнай музыкі на аснове дыдактычных прынцыпаў, перш за усё – ад простага да складанага ў адпаведнасці з размеркаваннем інструментаў па вучэбных семестрах. Дзякуючы матэрыялам дысцыпліны навучанне на беларускіх народных духавых інструментах спрыяе развіццю ў студэнтаў самастойнасці мастацка-вобразнага мыслення, усебаковаму развіццю творчай індывідуальнасці будучага спецыяліста духавога мастацтва, здольнага выконваць камерна-інструментальные, ансамблевыя ці аркестравыя творы як на асабістым базавым духавым інструменце (флейта, кларнет, саксафон, труба, трамбон і інш.), так і на беларускім народным духавым інструменце (дудка, дуда, акарына, драўляная труба і інш.) ці народным ударным інструменце: 1) санаціскныя ідэафоны («калотка», «лыжкі», «талеркі»); 2) націскныя ідэафоны («вугольнік», «брусочкі», «біла», «звон», «званок»); 3) патрэсваемые ідэафоны («кляшчоткі», «бразготкі», «шархуны»); 4) скрабковыя ідэафоны («трашчотка»); 5) шчыпковыя ідэафоны (гетэраглотачны «варган»); 6) мембранафоны: рамныя барабаны (аднабаковыя «бубны», аднабаковыя цыліндрычныя «барабаны»); мірлітоны («грэбень»).

Засваенне студэнтамі сутнасці асноў выканальніцкага майстэрства на беларускіх народных духавых інструментах прадугледжвае параўнальны аналіз і сувязь з музычна-тэарэтычнымі дысцыплінамі – «Тэорыя музыкі»; дысцыплінамі спецыялізацыі – «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Сусветная і нацыянальная гісторыя, тэорыя выканальніцтва на народных і ўдарных духавых інструментах», «Прафесійная педагогіка і методыка выкладання спецдысцыплін», «Методыка работы з аркестрам і ансамблем», «Інструментазнаўства і інструментоўка»; творча-практычнымі дысцыплінамі спецыялізацыі – «Аркестравы клас», «Інструментальны ансамбль» і інш.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – засваенне студэнтамі навыкаў выканальніцтва на беларускіх народных духавых і ўдарных музычных інструментах. Гэтыя навыкі на тым ці іншым бела-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рускім народным духавым, ударным музычным інструменце выпускнікі могуць выкарыстоўваць падчас асабістай працоўнай прафесійнай дзейнасці (сольнае, ансамблевае ці аркестравае выканальніцтва).

Асноўныя *задачы вучэбнай дысцыпліны* «Дадатковы народны інструмент»:

– атрымаць неабходныя веды ў народна-інструментальным кірунку музычнага мастацтва;

– развіць адпаведныя творча-выканальніцкія навыкі ў асабістай мастацка-прафесійнай дзейнасці;

– састаўляць планы самастойнай творча-выканальніцкай дзейнасці па засваенні асноў выканальніцкага майстэрства на беларускіх народных духавых інструментах, уключаючы інструктыўны матэрыял – практыкаванні, гамы, эцюды, мастацкі матэрыял – камерна-інструментальныя творы, партыі ансамблевых ці аркестравых твораў, сольныя партыі ў суправаджэнні аркестра духавых і ўдарных інструментаў;

– самастойна вызначаць ансамблевыя ці аркестравыя цяжкасці і ажыццявіць адпаведную работу па іх дакладным выкананні;

– дакладна ажыццяўляць настройку таго ці іншага беларускага народнага духавога музычнага інструмента з дапамогай цюнера ці фартэпіяна;

– ажыццяўляць пошукі найбольш эфектыўных канцэртных увасабленняў народнай традыцыйнай музыкі і сучасных аўтарскіх твораў народна-інструментальнага мастацтва;

– спрыяць сацыякультурнаму прэстыжу народна-інструментальнай спадчыны Беларусі і развіццю айчынных народных традыцый.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент» студэнты павінны *ведаць:*

– спецыфіку выканальніцкай падрыхтоўкі на свістковых, язычковых, амбушурных беларускіх народных духавых ці ўдарных інструментах;

– класіфікацыю, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці асноўных беларускіх народных духавых ці ўдарных інструментаў;

– сутнасць і змест этапаў і асаблівасцей сольнага выканальніцтва ў суправаджэнні фартэпіяна ці аркестра духавых і ўдар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных інструментаў, у складзе ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў;

*умець:*

– выкарыстоўваць асноўныя элементы выканальніцкага майстэрства на беларускіх народных духавых ці ўдарных інструментах;

– вырашаць праблемы гукаўтварэння, звязаныя са спецыфікай традыцыйных народных духавых інструментаў;

– ажыццяўляць карэктуру інтанавання, збалансавання дынаміка-акустычнага гучання ў працэсе сумеснага выканання твора ў суправаджэнні фартэпіяна ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў, у складзе ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў;

– карыстацца тэхналогіяй выканання штрыхоў, прыёмаў і манеры гучання ў адпаведнасці з жанрава-стылявой спецыфікай выконваемых твораў;

– дакладна выконваць метрарытмічныя структуры і прапануемую музычную арнаментыку (трэлі, групета, мардэнты і г. д.);

*валодаць:*

– асновамі выканання на храматычнай дудцы (сапрана *in C*) як асноўным дадатковым народным інструментам;

– асновамі выканання на дудзе *in D*, *in G* як асноўным дадатковым народным інструментам;

– асновамі выканання на акарыне *in C, in G* як дадатковым духавым народным інструменце;

– асновамі выканання на жалейцы *in G*, *in D* як дадатковым духавым народным інструменце;

– асновамі выканання на разнавіднасцях драўляных труб і рагоў як дадатковых духавых народных інструментах;

– асновамі выканання на народных ударных інструментах як дадатковым народным інструменце.

Падрыхтоўка студэнтамі заданняў падчас штодзённых аўдыторных, а таксама і пазааўдыторных самастойных заняткаў на беларускіх народных духавых свістковых, язычковых, амбушурных ці ўдарных інструментах прадугледжвае штосеместравую атэстацыю па выкананні сольных вучэбных праграм (*solo*; *solo* ў суправаджэнні фартэпіяна ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў; выкананне партый ансамблевых і аркестравых твораў; выкананне асабістых партый у складзе ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент» прадугледжана ўсяго 164 гадзіны, з якіх 70 гадзін – аўдыторныя індывідуальныя заняткі.

Рэкамендуемыя формы кантролю ведаў студэнтаў – экзамен і залікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўд. гадзін | |
|---|---|---|
| | усяго | інд. зан. |
| Уводзіны | 1 | 1 |
| **Раздзел I. Засваенне інструктыўных асаблівасцей выканання на народных музычных інструментах** | | |
| *Тэма 1.* Асаблівасці засваення функцыянальных асноў гукаатрымання на беларускіх народных духавых музычных інструментах | 7 | 7 |
| *Тэма 2.* Сістэма настройкі беларускіх народных духавых інструментаў у працэсе выканання | 4 | 4 |
| *Тэма 3.* Засваенне штрыхоў, традыцыйных і спецыфічных прыёмаў гуказдабывання на беларускіх народных духавых інструментах | 6 | 6 |
| *Тэма 4.* Фразіроўка пры ігры на беларускіх народных духавых інструментах | 8 | 8 |
| *Тэма 5.* Праблема дынаміка-акустычнага балансу пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Асаблівасці работы над метрарытмічнымі цяжкасцямі пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах | 6 | 6 |
| **Раздзел II. Засваенне мастацка-выразных асаблівасцей народных музычных інструментаў і развіццё выканальніцкіх навыкаў** | | |
| *Тэма 7.* Методыка развіцця навыкаў чытання нот з ліста пры ігры на беларускіх народных духавых інструментах | 6 | 6 |
| *Тэма 8.* Асаблівасці вывучэння вучэбна-педагагічнага і канцэртнага рэпертуару для беларускіх народных духавых інструментаў | 12 | 12 |
| *Тэма 9.* Асаблівасці вывучэння сольных канцэртных музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў у суправаджэнні духавога аркестра | 8 | 8 |
| *Тэма 10.* Асаблівасці вывучэння ансамблевых і аркестравых партый музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў у суправаджэнні духавога аркестра | 6 | 6 |
| *Тэма 11.* Асаблівасці падрыхтоўкі да канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на беларускіх народных духавых інструментах | 4 | 4 |
| **Разам…** | 70 | 70 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Сутнасць дысцыпліны і яе задачы. Месца дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент» у сістэме падрыхтоўкі выканаўцаў на народных духавых інструментах у сферы музычнага выканальніцтва (сольнае, ансамблевае, аркестравае).

Сувязь дысцыплінамі з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці:

1) музычна-тэарэтычнымі дысцыплінамі – «Тэорыя музыкі»;

2) дысцыплінамі спецыялізацыі – «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Сусветная і нацыянальная гісторыя, тэорыя выканальніцтва на народных і ўдарных духавых інструментах», «Прафесійная педагогіка», «Методыка выкладання спецдысцыплін», «Методыка работы з аркестрам і ансамблем», «Інструментазнаўства і інструментоўка»;

3) творча-практычнымі дысцыплінамі спецыялізацыі – «Аркестравы клас», «Інструментальны ансамбль».

Класіфікацыя тыпавога традыцыйнага і сучаснага мадыфікаванага народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя, яго функцыі, мастацка-выканальніцкія асаблівасці.

## Раздзел I. Засваенне інструктыўных асаблівасцей выканання на народных музычных інструментах

### *Тэма 1. Асаблівасці засваення функцыянальных асноў гукаатрымання на беларускіх народных духавых музычных інструментах*

Тыпавыя выканальніцкія формы, у якіх выкарыстоўваюцца народныя духавыя і ўдарныя інструменты. Спецыфіка ўключэння народных духавых і ўдарных інструментаў у сучасную выканальніцкую практыку (сольнае выканальніцтва; ансамблевае выканальніцтва; аркестравае выканальніцтва).

Засваенне функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей тыпавога традыцыйнага і сучаснага мадыфікаванага народнага духавога і ўдарнага інструментарыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 2. Сістэма настройкі беларускіх народных духавых інструментаў у працэсе выканання*

Асаблівасці інтанавання на беларускіх народных духавых інструментах (канструктыўныя, тэхналагічныя недахопы і шляхі іх пераадольвання). Узаемаабумоўленасць дакладнага інтанавання і арганалагічных асаблівасцей.

Меладычная, гарманічная настройка інструментаў і іх спецыфіка ў працэсе выканання *solo*, у складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Выкарыстанне розных спосабаў настройкі беларускіх народных духавых інструментаў (*пры дапамозе цюнера; пры дапамозе слыху; па камертоне; па гучанні другога інструмента* – духавога інструмента, беларускага народнага духавога інструмента).

Асаблівасці карэкціроўкі інтанавання ў працэсе сольнага ці сумеснага выканальніцтва: 1) прынцып ладатанальнага прыцягнення; 2) выкарыстанне дадатковай аплікатуры; 3) змяненне параметраў апертуры і амбушура; 4) карэкцыя экспрэсіі выканальніцкага дыхання.

*Тэма 3. Засваенне штрыхоў, традыцыйных і спецыфічных прыёмаў гуказдабывання на беларускіх народных духавых інструментах*

Паняцце «штрых», яго сутнасць і роля ў выканальніцкім музычным мастацтве. Разнавіднасці штрыхоў, якія выкарыстоўваюцца пры выканальніцтве на беларускіх народных духавых інструментах. Умоўныя абазначэнні асноўных штрыхоў, фарміраванне навыкаў іх выканання. Штрыхі як сродак артыкуляцыі.

Элементы і стадыі выканання штрыхоў: 1) пачатак (атака); 2) вядзенне; 3) заканчэнне гуку.

Асаблівасці і прыёмы гуказдабывання пры выкананні штрыхоў. Сутнасць узаемасувязі гуказдабывання і выканання штрыхоў.

Спецыфічныя штрыхі і прыёмы гуказдабывання, распаўсюджаныя ў народна-інструментальнай выканальніцкай практыцы.

*Тэма 4. Фразіроўка пры ігры на беларускіх народных духавых інструментах*

Паняцце «фразіроўка», яе сутнасць, значнасць і роля ў выканальніцкім музычным мастацтве. Асноўныя элементы фразі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роўкі пры ігры на беларускіх народных духавых інструментах: матыў; перыяд; фраза; кантрапункт.

Фразіроўка як сродак выразнасці ў адпаведнасці са стылістычнымі асаблівасцямі твораў (арыгінальныя творы ці іх інструментоўкі).

Спецыфіка дакладнасці фразіроўкі пры выканальніцтве на беларускіх народных духавых інструментах з улікам іх дынаміка-акустычных, этнаарганалагічных і канструктыўна-мадыфікаваных асаблівасцей.

*Тэма 5. Праблема дынаміка-акустычнага балансу пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах*

Дынаміка як мастацка-выразны сродак музычнага мастацтва і яе спецыфіка з улікам гучання беларускіх народных духавых інструментаў у *solo*, у складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

Паняцце аб рэльефе, фоне, аб’ёме і балансе гучання на беларускіх народных духавых інструментах. Шляхі дасягнення аб’ёму прасторавага гучання беларускіх народных духавых інструментаў.

Развіццё выканальніцкіх навыкаў для дасягнення збалансаванага гучання ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Прынцыпы кантрасту дынамікі гучання на беларускіх народных духавых інструментах. Узаемасувязь дынамікі і музычнай фактуры.

*Тэма 6. Асаблівасці работы над метрарытмічнымі цяжкасцямі пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах*

Паняцці «метр» і «рытм», іх сутнасць у музычным мастацтве.

Метрарытм як адзін з галоўных элементаў і мастацкіх сродкаў музыкі.

Формаўтваральнае значэнне рытму, вывучэнне тыпавых і іншых варыянтаў метрарытмічных асаблівасцей лепшых узораў беларускай народна-інструментальнай спадчыны (арыгінальныя творы, апрацоўкі народна-песенных і танцавальных мелодый).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё навыкаў выканання розных метрарытмічных камбінацый на беларускіх народных духавых інструментах у *solo*, у складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў (музычныя практыкаванні, гамы, эцюды, вучэбна-педагагічны і канцэртны рэпертуар).

Дасягненне дакладнасці метрарытму ў калектыўным выканальніцтве пры выкананні твораў у складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

## Раздзел II. Засваенне мастацка-выразных асаблівасцей народных музычных інструментаў і развіццё выканальніцкіх навыкаў

### *Тэма 7. Методыка развіцця навыкаў чытання нот з ліста пры ігры на беларускіх народных духавых інструментах*

Навыкі чытання нот з ліста і іх значнасць у працэсе падрыхтоўкі выканаўцаў на беларускіх народных духавых інструментах.

Развіццё выканальніцкіх навыкаў інтэнсіўнага засваення музычнага матэрыялу з мэтай пашырэння і засваення вучэбна-педагагічнага і канцэртнага рэпертуару.

Спосабы развіцця навыкаў чытання нот з ліста.

Актывізацыя і развіццё музыкальных здольнасцей у працэсе чытання нотнага тэксту ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

### *Тэма 8. Асаблівасці вывучэння вучэбна-педагагічнага і канцэртнага рэпертуару для беларускіх народных духавых інструментаў*

Прынцыпы састаўлення плана работы па вывучэнні музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў.

Этап першапачатковага знаёмства з творам (партытура, аўдыя- і відэазапіс, праслухоўванне трансляцыі сродкаў масавых камунікацый). Дэтальны музычна-выканальніцкі аналіз асаблівасцей вывучаемага твора і задача па стварэнні адпаведных музычных вобразаў у працэсе выканальніцтва на народных духавых інструментах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Работа над асноўнымі эпізодамі музычнага твора (развіццё навыкаў сумеснага выканальніцтва з улікам тэхнічных ансамблевых цяжкасцей у складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў; дынамічны баланс; штрыхі; фразіроўка; выкарыстоўванне дробнай тэхнікі; інтанацыя і інш.).

Шляхі вырашэння музычна-выканальніцкіх задач па стварэнні музычных вобразаў у працэсе канчатковага этапу выканальніцтва на беларускіх народных духавых інструментах у адпаведнасці з мастацка-эстэтычным патрабаваннем твораў (арыгінал, інструментоўка і г. д.).

### *Тэма 9. Асаблівасці вывучэння сольных канцэртных музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў у суправаджэнні духавога аркестра*

Выкарыстанне асноўных сродкаў музычнай выразнасці ў працэсе стварэння мастацкага вобраза. Інтэрпрэтацыя як тлумачэнне аўтарскіх тэкстаў. Асаблівасці выпрацоўкі пэўнай мастацкай канцэпцыі і пошуку выразных магчымасцей у працэсе ўвасаблення варыянтнай шматлікасці трактовак музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў. Суадносіны кампазітарскага і выканальніцкага пачаткаў, шматлікасць трактовак гэтага спалучэння ў выканальніцтве на беларускіх народных духавых інструментах.

Вывучэнне разнастайных жанрава-стылявых кірункаў. Асаблівасці выканання старадаўняй музыкі і яе інтэрпрэтацыя. Расшыфроўка знакаў скарачэння нотнага запісу і мелізматыкі.

Асаблівасці выканання на беларускіх народных духавых музычных інструментах эстрадных і джазавых твораў з улікам адпаведнай спецыфічнай манеры і стылю выканання.

### *Тэма 10. Асаблівасці вывучэння ансамблевых і аркестравых партый музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў у суправаджэнні духавога аркестра*

Работа над асноўнымі эпізодамі музычнага твора: развіццё навыкаў сумеснага выканальніцтва з улікам тэхнічных ансамблевых цяжкасцей у складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў; дынамічны баланс; штрыхі; фразіроўка; выкарыстоўванне дробнай тэхнікі; інтанацыя і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шляхі вырашэння музычна-выканальніцкіх задач па стварэнні музычных вобразаў у працэсе канчатковага этапу выканальніцтва на беларускіх народных духавых інструментах у адпаведнасці з мастацка-эстэтычным патрабаваннем твораў (арыгінал, інструментоўка і г.д.).

Спецыфіка выканання партый сольных эпізодаў для беларускіх народных духавых інструментаў у творах народна-інструментальнай, народна-песеннай, харавой спадчыны беларусаў (работа па вывучэнні арыгінальнага рэпертуару, выкананне пералажэнняў, аранжыровак і інтэрпрэтацый традыцыйных народна-інструментальных, народна-песенных і харавых твораў; асаблівасці сцэнічнага майстэрства і інш.). Спалучэнне дакладнага інструментальнага выканання жанрава-стылявых кірункаў музычных твораў. Асаблівасці выканання старадаўняй музыкі і яе інтэрпрэтацыя. Расшыфроўка знакаў скарачэння нотнага запісу і мелізмаў.

Асаблівасці выканання эстрадных твораў з улікам спецыфічнай манеры і стылю выканання. Дасягненне мастацкіх эфектаў шляхам злучэння беларускіх народных духавых інструментаў і сучаснага музычнага інструментарыя (фартэпіяна; аркестравыя духавыя інструменты ў складзе ансамбля ці аркестра; эпізадычныя інструменты; электрафікаваныя сучасныя музычныя інструменты – разнастайнасці клавішных інструментаў, бас-гітара; ударная ўстаноўка, перкусія і інш.).

### *Тэма 11. Асаблівасці падрыхтоўкі да канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на беларускіх народных духавых інструментах*

Развіццё выканальніцкіх навыкаў падчас падрыхтоўкі да канцэртна-выканальніцкай дзейнасці з мэтай фарміравання мастацкага густу выканаўцы і эстэтычнага выхавання слухачоў. Шляхі ўдасканалення прафесійнага майстэрства. Сцэнічна-псіхалагічная падрыхтоўка выканаўцаў на народных духавых інструментах для ўдзелу ў значных сацыякультурных мерапрыемствах. Арганізацыйна-творчыя пытанні падрыхтоўкі і правядзення канцэртнага выступлення. Эмацыянальна-псіхалагічная падрыхтоўка выканаўцаў (асабістая падрыхтоўка да публічнага выступлення; аўтатрэнінг; вопыт папярэдняй канцэртнай дзейнасці). Жанрава-стылявыя і сацыяльна-ўзроставыя ўмовы (дыферэнцыраваны падыход у складанні выконваемай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канцэртнай праграмы, разлічанай на розны музычны густ той ці іншай сацыяльнай групы). Эстэтыка-сцэнічныя ўмовы (антураж, сцэнічны выгляд і імідж у адпаведнасці са стылем і эпохай выконваемых твораў). Пытанні акустыкі і тэхнічна-інструментальнага забеспячэння выступлення ў канцэртнай зале або на пленэры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Ансамблевае выканаўства : вучэб. прагр. для выш. навуч. устаноў па спецыяльнасці 16 01 06 11 – “духавыя інструменты (народныя)” [Рэкамендавана ў якасці тыпавой] / склад.: А. Л. Карацееў, А. А. Караткевіч, І. А. Мангушаў. – Мінск : БДУ культуры, 2003. – 22 с.

*2. Гром, У. М.* Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 1. Сольнае выкананне. – 259 с.

*3. Гром, У. М.* Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – 217 с.

*4. Гром, У. М.* Заіграйце, музыкі!: рэпертуар. зб. для фальклорных калектываў : у 2 ч. / У. М. Гром. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – Ч. 2. – 155 с.

*5. Гром, У. М.* Дударэньку-гаспадэньку: рэпертуар. зб. для аматараў ігры на дудзе / У. М. Гром ; БелІПК. – Мінск, 1999. – 54 с.

*6. Коротеев, А. Л.* Генезис образования специалистов духового исполнительского искусства Беларуси (народно-инструментального, профессионального и любительского) / А. Л. Коротеев // Музыкальное искусство и музыкальное образование на рубеже веков: материалы научных конференций «Беларусь и музыкальное наследие XX столетия: поиски и обретения», 29–30 нояб. 2001 г., Минск, «Музыкальное образование в контексте художественной культуры», 10–11 дек. 2002 г., Минск. – Вып. 1. – Минск : Белорус. гос. акад. музыки, 2004. – С. 138–146.

*7. Коротеев, А. Л.* Дисбаланс квалификационно-педагогических компонентов системы подготовки специалистов профессионального и любительского духового искусства Беларуси / А. Л. Коротеев // Проблемы развития педагогического образования: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 17 дек. 2004 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

редкол.: А. В. Торхов (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2005. – С. 375–377.

8. *Коротеев, А. Л.* Использование функционально-ролевых игр в процессе подготовки специалистов духового искусства высшей квалификации Беларуси (народные и оркестровые духовые, ударные инструменты) / А. Л. Коротеев // Игровые технологии в современном воспитательном процессе : материалы Респ. науч.-практ. конф., Мозырь, 12–13 февр. 2004 г. : в 3 ч. – Мозырь : МГПУ, 2004. – Ч. 1. – С. 18–21.

9. *Коротеев, А. Л.* Мотивационные и аттестационно-квалификационные аспекты вузовской системы подготовки исполнителей на белорусских народных духовых музыкальных инструментах / А. Л. Коротеев // Высшая школа: проблемы и перспективы : материалы 6-й Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 23–24 нояб. 2004 г. – Минск : РИВШ, 2004. – С. 165–166.

10. *Коротеев, А. Л.* Нравственно-эстетические и художественно-творческие критерии формирования профессиональных способностей исполнителей на духовых инструментах / А. Л. Коротеев // Маральна-эстэтычнае выхаванне моладзі сродкамі мастацтва і літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 24–25 лют. 2000 г. / Беларус. ун-т культуры ; рэдкал.: А. У. Пазнякоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2000. – С. 63–67.

11. *Коротеев, А. Л.* Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодежи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария) / А. Л. Коротеев // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання): зб. навук. арт. / склад. і навук. рэд. І. І. Сучкоў. – Мінск : Бестпринт, 2004. – С. 87–94.

12. *Карацееў, А. Л.* Забеспячэнне працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ культуры і мастацтваў Беларусі (вучэбна-метадычныя і арганізацыйныя аспекты) / А. Л. Карацееў // Кафедра як асноўны цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў да дзейнасці ў сацыякультурнай і інфармацыйна-камунікатыўнай сферах : матэрыялы навук.-метад. канф., Мінск, 19–20 лют. 2004 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 51–54.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. *Карацееў, А. Л.* Роля прагрэсіўных тэхналогій падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў працэсе распрацоўкі сучасных адукацыйных стандартаў / А. Л. Карацееў // Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты : матэрыялы навук.-метад. канф., Мінск, 2–3 лют. 1999 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – С. 91–96.

14. *Назина, И. Д.* Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые / И. Д. Назина ; под ред. М. Я. Гринблат. – Минск : Наука и техника, 1979. – 144 с.

15. *Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.

16. *Скорабагатаў, В.* Зайгралі спадчынныя куранты: цыкл нарысаў з гісторыі праф. муз. культуры Беларусі / В. Скорабагатаў. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 180 с.

*Дадатковая*

1. *Буданков, О. А.* Практический курс игры на русских народных духовых и ударных инструментах / О. А. Буданков, М. Б. Вахутинский, В. К. Петров. – М. : Музыка, 1991. – 192 с.

2. *Васильев, Ю.* Рассказы о русских народных инструментах / Ю. Васильев, А. Широков. – М. : Сов. композитор, 1976. – 95 с.

3. *Вертков, К.* Русские народные музыкальные инструменты / К. Вертков. – М. : Музыка, 1975. – 280 с.

4. *Коротеев, А. Л.* Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской органологии) / А. Л. Коротеев // IV Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры: матэрыялы чытанняў, Мінск, 24–26 мая 1998 г. : у 2 ч. / ЕГУ, Беларус. ун-т культуры ; рэдкал.: А. У. Пазнякоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – Ч. 2. – С. 168–176.

5. *Коротеев, А. Л.* Духовое искусство Беларуси: жанрово-стилистические поиски и перспективы развития / А. Л. Коротеев // Музыкальное творчество и XXI век: традиции, новации и перспективы : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 21 апр. 2000 г. – Минск : Технопринт, 2000. – С. 41–45.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Коротеев, А. Л.* Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А. Л. Коротеев // X Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 24–26 мая 2004 г. / рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66–72.

7. *Карацееў, А. Л.* Неардынарная з’ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння / А. Л. Карацееў // Весн. Беларус. дзярж. у-та культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 119–122.

8. *Карацееў, А. Л.* Спецыяльнасць «Духавыя інструменты (народныя)» / А. Л. Карацееў // Крытэрыі ацэнкі ведаў абітурыентаў на ўступных экзаменах: метад. указанні; пад агул. рэд. А. І. Смоліка. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры, 2003. – С. 81–84.

9. *Константинов, И.* Приходите слушать канклес / И. Константинов // Наука и жизнь. – 1989. – № 6. – С. 111–113.

10. *Коротеев, А. Л.* Особенности развития духового искусства Восточной Европы: органологическое исследование и эволюция форм народно-инструментального исполнительства на духовых и ударных инструментах / А. Л. Коротеев // Украіньска культура в іменах і дослідженнях: наукові записки Рівненьского державного інституту культури. – Рівне : Рівненський державний інститут культури, 1998. – Віп. 3. – С. 296–320.

11. *Логвін, В.* Традиціі інструментального виконавства в чеських поселеннях Волині / В. Логвін // Украіньска культура в іменах і дослідженнях: наукові записки Рівненьского державного інституту культури. – Рівне : Рівненський державний інститут культури, 1977. – Віп. 1. Волинске Полісся в контексти слов’янськоі культури. – С. 133–134.

*12.* Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка: сб. ст. и материалов: в 2 ч. / сост. И. В. Мациевский; под общ. ред. Е. В. Гиппиуса. – М. : Сов. композитор, 1987. – Ч. 1. – 264 с.

*13.* Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка: сб. ст. и материалов: в 2 ч. / сост. И. В. Мациевский ; под общ. ред. Е. В. Гиппиуса. – М. : Сов. композитор, 1988. – Ч. 2. – 327 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам тэрміналогіі, асобных фактаў, крытэрыяў і форм кантролю ведаў вывучаемай дысцыпліны |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных выканальніцкіх навыкаў і тэрмінаў атэстацыі па вывучаемай дысцыпліне |
| 3 (тры) | Недастатковы ўзровень выканання студэнтам праграмнага матэрыялу |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам матэрыялу вывучаемай дысцыпліны |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Наяўнасць неістотных памылак пры выкананні інструктыўнага матэрыялу і музычных твораў |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асаблівасцей выканання на беларускіх народных духавых інструментах. Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Трывалыя веды і выканальніцкія навыкі па асноўных кірунках дысцыпліны, разуменне мастацка-функцыянальных асаблівасцей беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак падчас выканання ансамблевых, аркестравых партый ці solo на беларускіх народных духавых інструментах |
| 8 (восем) | Дастатковыя веды па асноўных тэмах дысцыпліны аб мастацка-функцыянальных асаблівасцях беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у сучасных умовах развіцця культуры. Свабоднае выкананне ансамблевых, аркестравых партый ці solo на беларускіх народных духавых інструментах. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак падчас выканання |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 9 (дзевяць) | Трывалыя веды па асноўных тэмах дысцыпліны аб мастацка-функцыянальных асаблівасцях беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у сучасных умовах развіцця культуры. Трывалыя выканальніцкія навыкі падчас выканання ансамблевых, аркестравых партый ці solo на беларускіх народных духавых інструментах. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак падчас выканання |
| 10 (дзесяць) | Поўныя, трывалыя і глыбокія веды па асноўных тэмах дысцыпліны аб мастацка-функцыянальных асаблівасцях беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у сучасных умовах развіцця культуры. Выдатныя выканальніцкія навыкі падчас выканання ансамблевых, аркестравых партый ці solo на беларускіх народных духавых інструментах. Адсутнасць памылак падчас выканання |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка асабістых кантрольных заданняў па выкананні інструктыўнага матэрыялу (практыкаванні, гамы, эцюды), музычных твораў, партый ансамблевых ці аркестравых твораў;

– падрыхтоўка асабістых кантрольных заданняў па выкананні solo ў суправаджэнні аркестра духавых і ўдарных інструментаў;

– сольныя выступленні на пасяджэнні адпаведнай секцыі выніковых навукова-творчых канферэнцый аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў;

– падрыхтоўка сольнага твора да канцэртнага выступлення ў суправаджэнні аркестра духавых і ўдарных інструментаў;

– атэстацыя ведаў і выканальніцкіх навыкаў ігры на народных музычных інструментах падчас правядзення іспыту (кантрольны ўрок, залік, экзамен).

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Дзеля ажыццяўлення самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў па засваенні неабходных матэрыялаў дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент» выкладчыку неабходна вызначыць сутнасць спецыфікі і асаблівасцей выканання на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах.

З мэтай актывізацыі вучэбна-выканальніцкай і канцэртнай дзейнасці студэнтаў прапануецца работа са спецыяльнымі творамі для беларускіх народных духавых інструментаў у суправаджэнні з ансамблем ці аркестрам духавых і ўдарных інструментаў.

Падчас падрыхтоўкі адпаведных матэрыялаў па вывучэнні дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент» у студэнтаў павінны фарміравацца ўменні і навыкі выканання твораў у суправаджэнні з фартэпіяна ці ў складзе ансамбля, аркестра духавых і ўдарных інструментаў, а таксама і выкананне сольных твораў на беларускіх народных духавых інструментах у суправаджэнні аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Эфектыўным спосабам засваення трывалых ведаў па практычных пытаннях выканання на беларускіх народных духавых інструментах і фарміравання адпаведных выканальніцкіх навыкаў павінны стаць асабістыя заданні па засваенні як вучэбнага, так і канцэртнага рэпертуару.

Важнай умовай засваення трывалых ведаў студэнтамі па дысцыпліне «Дадатковы народны інструмент» з’явіцца знаёмства з нотным матэрыялам твораў, якія прызначаны для выканальніцтва на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах (*solo, ансамбль, капэла*), а таксама адбор і праслухоўванне адпаведных фанаграм з мэтай вывучэння мастацка-выразных асаблівасцей узораў выступленняў сусветна вядомых і лепшых айчынных выканаўцаў на народных духавых і ўдарных музычных інструментах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ДАДАТКОВЫ НАРОДНЫ ІНСТРУМЕНТ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць*
*(інструментальная музыка), спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02*
*Інструментальная музыка духавая*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,33. Ул.-выд. арк. 0,86. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ